АБ УСІМ, ШТО БАЛІЦЬ

№26/33/—25.VI—1976 ТОЛЬКІ ГУТАРКА ХОДЗІЦЬ ТАКАЯ...

МЕНСК Я.КУПАЛА

# ГУТАРКА

## I. У ХВАСЦЕ

Зайшоўшы ў краму, бачу я
Даўжэзны хвост чаргі:
"За чым стаяць?"
—"Даюць хвасты"
Іду ўзглянуць на іх.
І бачу я: апроч хвастоў
Яшчэ ёсць і мазгі,
Але ніхто іх не бярэ.
Бяруць адны хвасты.
А цёткі ўздумалі, што я
Хачу ўзяць без чаргі,
Мне ў хвост усыпалі, і я
Стаў без агляддкі ў хвост.
Стаю, газэту разгарнуў,
А ў ёй пра ўздым, пра рост.
"Чаму ж тады адны хвасты
Перад прылаўкам і за ім?"
Я не заўважыў, як прайшоў
І час у думках вось такіх.
"Што вам?"—пытае прадавец.
"Мне пяць кіло хвастоў".

А"Вы што?Ды іх ужо няма".  
І праўда,бачу я,  
Што разабралі ўсе хвасты,  
І знік за мною хвост.  
І агарнула мяне злосць,  
А тут хтосьці сказаў:  
"Мазгі бяры,яны табе  
Спатрэбяцца шчэ больш".

[redacted]